Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 СНЕЖНЯ 2006 г.
СЕРАДА
№ 270 (25859)

Кошт 310 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Абмеркаваны меры па ўдасканаленню дзяржпалітыкі ў сферы адукацыі

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з членамі Рэспубліканскага савета рэктараў вышэйшых навучальных установ.

На нарадзе былі абмеркаваны важныя пытанні і праблемы, якія маюцца ў сферы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і якія патрабуюць усебаковага абмеркавання і практычнага вырашэння. Адна з іх — няпростая кадравая сітуацыя ў вышэйшых навучальных установах. Паводле слоў А. Лукашэнкі, у ВНУ «памяншаецца колькасць выкладчыкаў, што маюць навуковыя ступені і званні», а ў «маладых спецыялістаў паніжаецца цікавасць да навуковай кар'еры і выкладчыцкай працы».

Наступная праблема датычыцца структуры вышэйшай адукацыі, эфектыўнасці правядзення ўступнай кампаніі. Паводле слоў А. Лукашэнкі, у грамадстве працягваюць гучаць крытычныя заўвагі адносна ўступнай кампаніі гэтага года, у тым ліку і той яе часткі, што датычыцца правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. На яго думку, падчас вызначэння ведаў абітурыента ў выніку тэсціравання не ўлічваюцца многія якасці будучага студэнта.

Сярод іншых праблем, якія існуюць у сферы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, кіраўнік дзяржавы назваў абгрунтаванасць дыферэнцыраваных тэрмінаў навучання; прывядзенне аб'ёмаў і структуры падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасць з рэальнымі патрэбамі эканомікі; фарміраванне канструктыўнага светапогляду ў студэнцкай моладзі. Паводле слоў А. Лукашэнкі, адзін з накірункаў вырашэння апошняй праблемы — упарадкаванне і паляпшэнне выкладання грамадскіх і гуманітарных дысцыплін.

Аляксандр Лукашэнка таксама лічыць ненармальнай сітуацыю, калі ў асобных гімназіях практыкуюць «адзін урок беларускай мовы ў тыдзень і шэсць урокаў англійскай». «Англійскую мову трэба ведаць, але трэба ведаць і сваю родную мову», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Былі ўзгаданы і выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. На думку кіраўніка дзяржавы, напярэдадні гэтай важнай грамадска-палітычнай кампаніі неабходна прааналізаваць эфектыўнасць усёй ідэалагічнай і выхаваўчай працы ва ўстановах адукацыі.

Увагуле ж А. Лукашэнка падкрэсліў, што яго заўсёды насцярожвалі новаўвядзенні ў сферы адукацыі, хоць у ёй (усё ж такі гэта не эканоміка) і магчымы радыкальныя пераўтварэнні. Спрабаваліся яны праводзіцца і ў нас, але іх прыпынілі. Як лічыць А. Лукашэнка, правільна, бо, напрыклад, Расія, якая пайшла далей, цяпер вяртаецца да таго, што было ў часы былога СССР.

Падчас свайго даклада старшыня савета рэктараў Уладзімір Шымаў расказаў аб дэфіцыце прафесарска-выкладчыцкага саставу. Аб тым, што лепшыя выпускнікі не зацікаўлены ў далейшым павышэнні якасці адукацыі, і гэта можа прывесці да «інтэлектуальнага крызісу грамадства». Што рэдкім стаў конкурс у аспірантуру, у якую ў большасці паступаюць «сераднякі». У якасці аднаго з выйсцяў з сітуацыі У. Шымаў прапанаваў павялічыць матэрыяльную зацікаўленасць. Згодна з рознымі варыянтамі прапаноў, грашовыя затраты абыдуцца дзяржаве ў 24,5 ці 47,7 млрд рублёў. Другая прапанова У. Шымава датычыцца пенсійнага забеспячэння, бо «маладыя спецыялісты павінны ведаць, што іх чакае годная старасць». Паводле слоў У. Шымава, пасля павышэння заробкаў неабходна ўвесці норму, згодна з якой сумяшчэнне можа быць магчымым толькі пры наяўнасці пісьмовай згоды асноўнага наймальніка.

Каментуючы прапановы У. Шымава, А. Лукашэнка адзначыў, што не супраць павышэння выплат для выкладчыцкага саставу ВНУ. Аднак грошы неабходна размяркоўваць эфектыўна, «бо прафесары і дацэнты таксама не аднолькавыя». У якасці станоўчага прыкладу ён прывёў сітуацыю ў сферы аховы здароўя. Там быў вызначаны пералік асоб, якія праводзяць сапраўды складаныя аперацыі і якім было вырашана рабіць істотныя даплаты. Як адзначыў А. Лукашэнка, «калі хочаш шмат зарабляць, дарасці да гэтага».

Падводзячы вынікі нарады, А. Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў, што падтрымлівацца будуць тыя, хто гэтага заслугоўвае. Ён пералічыў меры, якія можна прыняць для сацыяльнай падтрымкі выкладчыцкага саставу ўстаноў адукацыі. Паводле слоў, для замацавання кадраў у сферы адукацыі неабходны механізм забеспячэння жыллём шляхам мэтавага будаўніцтва ў кожным горадзе. Неабходна таксама распрацаваць сістэму пазачарговага выдзялення льготных крэдытаў, першачарговага выдзялення службовага жылля, кампенсацый за здыманне жылля. Усе гэтыя прапановы павінны будуць знайсці адлюстраванне ў праекце дакумента аб дадатковых мерах па сацыяльнай падтрымцы прафесарска-выкладчыцкага саставу і навуковых работнікаў, які павінен быць унесены на разгляд Прэзідэнта ў першым квартале наступнага года.

А. Лукашэнка таксама адзначыў, што ў выкладчыцкім корпусе знаходзяцца людзі, якія выкарыстоўваюць кафедру ВНУ для антыдзяржаўных мэтаў. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што «кожны выкладчык абавязаны выхоўваць павагу да дзяржавы». У сувязі з гэтым ён лічыць, што неабходна правесці праверку выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у ВНУ, а потым з улікам яе вынікаў правесці нараду.

Што ж датычыцца правілаў прыёму ў ВНУ, то А. Лукашэнка лічыць: тут пакуль няма крытычнай сітуацыі, каб нешта змяняць. Аднак, улічваючы крытычныя заўвагі, асобныя палажэнні правілаў могуць будуць дапоўненыя. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў Міністэрству адукацыі яшчэ раз прадумаць падыходы да стварэння тэставых заданняў, выстаўлення адзнак па іх. Ён лічыць, што тэсты «павінны быць не завоблачнымі, а зямнымі, разлічанымі на нашых школьнікаў». Таксама неабходна ўпарадкаваць прыём на папулярныя спецыяльнасці, надаць больш увагі якаснаму адбору будучых студэнтаў, у тым ліку, магчыма, і ўспомніць тыя часы, калі неабходна было прадстаўляць характарыстыкі.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

«КАМУНАРКА» ДА СВЯТА ГАТОВА!

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

Кандытарская фабрыка «Камунарка» выпусціць да Новага года 1,1 млн падарункавых набораў вагой ад 300 г да 2,5 кг. Ужо да 8 лістапада на прадпрыемстве было скамплектавана каля 40 працэнтаў ад запланаванай колькасці падарункаў і частка іх накіравана ў рознічны гандаль. Усяго сфарміраваны заказы на адгрузку 78 працэнтаў ад аб'ёму выпуску навагодніх набораў. У гэтым годзе калекцыя дзіцячых падарункаў уключае 21 набор. Самымі вялікімі наборамі стануць «Дзед Мароз» вагой 2,5 кг і «Глобус» — 2 кг. Кошт падарункаў вагаецца ад Br4 тыс. да Br60 тыс. Наборы пастаўляюцца ў аптова-рознічную сетку і фірменныя магазіны. Асноўная доля адгрузак прыходзіцца на прафсаюзныя арганізацыі. Частка навагодніх падарункаў прадпрыемства мае намер адгрузіць і на знешні рынак. Так, у ЗША ўжо адпраўлены ўвесь асартымент набораў у аб'ёме 5 тыс. штук. Рыхтуецца да адгрузкі ў гэту краіну другая партыя прадукцыі — каробкі шакаладных цукерак з навагодняй сімволікай. Акрамя таго, «Камунарка» паставіла прадукцыю ў Германію і Малдову. Кантэйнер з навагоднім асартыментам прадукцыі будзе адпраўлены таксама ў Ізраіль.

НА ЗДЫМКУ: камплектаванне навагодніх падарункаў для дзяцей на «Камунарцы».

У БЕЛАРУСІ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ ПЕРАНОСІЦЦА З АЎТОРКА 2 СТУДЗЕНЯ 2007 ГОДА НА СУБОТУ 30 СНЕЖНЯ 2006 ГОДА

Адпаведнае рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў ад 18 снежня гэтага года № 1677.

У адпаведнасці з пастановай урада, арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці ажыццяўляць перанос рабочага дня ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Людміла САЦ, БЕЛТА.

Супрацоўніцтва з Суданам

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 19 снежня сустрэўся з Міністрам замежных спраў Рэспублікі Судан Лэмам Акалам Аджавінам.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь гатова развіваць гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне з Суданам. Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Суданам, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Лэм Акал Аджавін перадаў Аляксандру Лукашэнку пасланне Прэзідэнта Судана, які ў 2004 годзе наведваў Беларусь з афіцыйным візітам. Дыпламат пацвердзіў запрашэнне Прэзідэнту Беларусі наведаць з візітам Судан. Беларускі лідар выказаў гатоўнасць наведаць з візітам у адказ гэту дзяржаву: «Беларусь развівае з Суданам плённы дыялог. У бліжэйшы час мы выканаем сваё абяцанне, якое было дадзена Прэзідэнту Судана ў час яго візіту ў Мінск, і прыедзем, каб бліжэй пазнаёміцца з вашай краінай, вашымі магчымасцямі. Мы хочам, каб гэты візіт быў не проста азнаямляльным, а выніковым», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Законапраект абароніць работніка незалежна ад формы ўласнасці прадпрыемства

Законапраект «Аб ахове працы» адобраны на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое адбылося 19 снежня пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

«Людзі працуюць не толькі на дзяржаўных прадпрыемствах, але і ў прыватным сектары, — падкрэсліў кіраўнік урада. — Таму наша задача ў тым, каб кожны работнік быў абаронены незалежна ад формы ўласнасці наймальніка». «У Беларусі ўмацоўваецца тэндэнцыя скарачэння колькасці няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, — аб гэтым паведаміў, прадстаўляючы законапраект, міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Уладзімір Патупчык. — Аднак у выніку ЧП штогод гінуць каля 200 чалавек, многія работнікі цяжка траўміруюцца. Лідзіруе па ўзроўню вытворчага траўматызму прамысловасць, энергетыка і сельская гаспадарка. У мінулым годзе з-за траўматызму на вытворчасці страчана 156 тыс. чалавека-дзён. Выплаты Белдзяржстраха склалі каля Br80 млрд».

БЕЛТА.

Расійскі бок лічыць, што перагаворы з Беларуссю аб пастаўках газу ідуць канструктыўна

Перагаворы Расіі і Беларусі па газавай тэматыцы працягваюцца. Яны ідуць канструктыўна, і ў расійскага боку ў гэтых адносінах ёсць пэўная ступень аптымізму, заявіў першы намеснік прэс-сакратара прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў 19 снежня ў Маскве на брыфінгу ў РІА «Навіны».

Ён адзначыў, што Газпрам ідзе па шляху ўстанаўлення экспартных цэн для блізкага і далёкага замежжа ў адпаведнасці з міжнародным узроўнем. Адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА аб далейшым развіцці сітуацыі, звязанай з увядзеннем Расіяй мытных пошлін на нафту для Беларусі, Дзмітрый Пяскоў адзначыў: «Расійска-беларускія адносіны — гэта асобая субстанцыя. Мы імі вельмі даражым. Па дадзенай праблеме вельмі шмат было сказана на нядаўняй сустрэчы двух прэзідэнтаў Беларусі і Расіі на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы».

Лілія КРАПІВІНА, БЕЛТА.

Увага: «прамая лінія»!

ДАПАМАЖЫЦЕ ПАЗВАНОЧНІКУ

На вашы пытанні адкажа ***Арнольд Фёдаравіч СМЕЯНОВІЧ, загадчык нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар.***

«Прамая лінія» адбудзецца ў пятніцу, 22 снежня, па нумарах: 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 287 18 29 і 287 18 36.

ФОРМУЛА ПАСЛЯДОЎНАГА ЎЗДЫМУ: ГУСТ, ЯКАСЦЬ, АСАРТЫМЕНТ

1976 2006

Буйнейшае прадпрыемства мясаперапрацоўчай галіны краіны — ААТ «Слуцкі мясакамбінат» у год свайго 30-годдзя дэманструе найвышэйшыя тэмпы росту і развіцця

Дырэктар ААТ «Слуцкі мясакамбінат» Аляксандр Каламіец і галоўны тэхнолаг Ганна Васіленка (здымак зроблены на рэспубліканскай канферэнцыі «Якасць-2006», на якой была прадстаўлена прадукцыя слуцкага мясакамбіната).

Колькі слоў з недалёкай гісторыі

Камбінат будаваўся з праектнай магутнасцю, разлічанай на выпуск 120 тон мяса і 20 тон каўбасы ў суткі, і быў зарыентаваны найперш на пастаўку сваіх вырабаў такім прамысловым цэнтрам і мегаполісам, як Масква і Ленінград. Запатрабаванай была і спадарожная прадукцыя — шкуры жывёлін, кішэчная сыравіна, мяса-косная мука, субпрадукты.

З гадамі адбывалася перарыентацыя вытворчасці, і паступова ўдзельная доля каўбасных вырабаў у агульным аб'ёме ўзрастала, мяняўся асартымент. Цяпер дзейнасць камбіната скіравана на задавальненне пакупніцкіх запытаў у першую чаргу насельніцтва сваёй рэспублікі.

Асабліва плённымі сталі для калектыву апошнія тры гады, калі яго ўзначаліў Аляксандр Каламіец. Працоўная біяграфія Аляксандра Іванавіча цесна звязана з горадам харчавікоў Слуцкам: працаваў на цукровым заводзе, потым 15 гадоў галоўным інжынерам мясакамбіната, і вось ужо тры гады — яго дырэктар. Усе асаблівасці, усе тонкасці і сакрэты вытворчасці, вядома ж, спасцігаў па «першакрыніцах» таго часу — на старым, малаэфектыўным абсталяванні, недахопе сыравіны, на праблемах санітарнага парадку, выканаўчай дысцыпліны...

У пэўным сэнсе гэтыя тры гады можна лічыць справаздачай дырэктара на перадюбілейным аглядзе апошніх дасягненняў камбіната. А яны даволі ўнушальныя. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў 2004 годзе ўзрос да папярэдняга на 25 працэнтаў, у наступным — на 15, за 10 месяцаў гэтага года — на 22,5 працэнтаў, а па выніках года прагназуецца яшчэ вышэйшы тэмп. Прырост жа выпуску спажывецкіх тавараў дасягнуў 24,9 працэнта!

Заканадаўцы густу

За кошт якіх фактараў гэта дасягаецца? За кошт многіх. Але калі абагуліць зробленае і выказаць адным словам, то гэта будзе — абнаўленне. Яно ажыццяўляецца па ўсіх напрамках. Датычыцца гэта асартыменту або паляпшэння якасці ці тэхнічнага пераўзбраення або стварэння належных умоў працы.

— Над абнаўленнем нашай наменклатуры мы працуем пастаянна, — сведчыць галоўны тэхнолаг Ганна Васіленка. — Цяпер у вытворчым цыкле знаходзіцца 237 назваў каўбасных вырабаў, з іх 131, ці 63,3 працэнта — новыя віды. Гэтаксама і з паўфабрыкатамі. З 80 назваў 41, або 53,1 працэнта зноў жа выпушчаныя ўпершыню.

Адразу ж варта заўважыць, што трэцяя частка абноўленага асартыменту — уласныя распрацоўкі спецыялістаў Слуцкага мясакамбіната. Група тэхнолагаў з сямі чалавек на чале з Ганнай Іванаўнай, у якой аб'яднаны прадстаўнікі службы якасці, стандартызацыі, цэхавыя знаўцы тэхпрацэсу, чуйна ставіцца да запытаў спажыўцоў і імгненна рэагуе на іх новымі прапановамі прадукцыі. Дзесьці прыпраўку другую ўвялі, дзесьці тэхналагічны працэс падкарэктавалі, дзесьці сыравінную прапорцыю змянілі... У такіх штодзённых пошуках, пераканана Ганна Іванаўна, і адшліфоўваюцца новыя каўбасныя знаходкі, з'яўляюцца мясныя «разыначкі».

Сёлета, напрыклад, поўнасцю змянілі ранейшы пералік паўвэнджаных каўбас. Асвоілі такі від, як падвэнджаныя вырабы — падабаюцца пакупнікам. Пашырылі таксама выпуск сыравэнджаных прысмакаў, якія напамінаюць хатнія мясныя прысмакі.

Большым попытам у пакупнікоў стала карыстацца вяндліна ў кавалачках. Яе таксама гатуюць як па традыцыйных тэхналогіях, так і па новых, сучасных: абсыпаных прыправамі, ва ўпакоўцы і без яе... Не грэбуецца нічога з таго, што ведае і памятае народная кулінарыя, што выпрабавалі майстры гатавання самых вытанчаных далікатэсаў.

Не забываюць на камбінаце пашыраць і пералік таннай прадукцыі. «Выпеставаная» слуцкімі заканадаўцамі густу па іх жа ўласных рэцэптах, яна мае даволі шырокую папулярнасць. Ліверныя каўбасы, зельцы, сальцісоны прывабліваюць спажыўцоў і невысокай цаной, і выдатным смакам.

Інакш кажучы, пра «змест» г.зн. начынку слуцкіх мясных вырабаў беларускаму ці расійскаму пакупніку, распавядаць не трэба. Спрабаваў, ведае! Але ў наш час «форма» ўсёй гэтай смакаты — таксама рэч не апошняя. На святочны стол непрывабны тавар не пакладзеш. Таму і мудрагеляць спецыялісты над знешнім выглядам сваёй прадукцыі, імкнуцца, каб ён адпавядаў бачанню яе пакупніком, яго пажаданням.

Сыравэнджаныя каўбасы сталі рабіць з падпрэсоўкай, у барановых кішцы, пузыры. Каб каўбасныя вырабы лепш захоўваліся, пачалі прымяняць вакуумную ўпакоўку. У яе можна ўкласці прадукт і скрылікамі, і кавалачкамі, і ў цэлым выглядзе. Дарэчы, практычна ўсё, што выпускаецца на камбінаце, мае падоўжаныя тэрміны захоўвання: вышэйшыя гатункі да 30 сутак, першыя — да 25, вяндліна ў вакуумнай упакоўцы — да 20. Тэрміны каўбасных вырабаў у натуральнай абалонцы падоўжаны да 5—6 сутак. У выніку, выгадна і гандлю, і пакупнікам.

Якасць і яшчэ раз якасць

Праблему выпуску прадукцыі высокіх спажывецкіх уласцівасцяў нельга адасобіць ад шырокага комплексу мераў па ўдасканаленню вытворчасці, найперш, тэхнічнага пераўзбраення, санітарна-гігіенічнага парадку і г.д. Хутчэй наадварот, стандарты якасці дыктуюць кіраўніцтву план яго стратэгічных і аператыўных дзеянняў. «Для нас якасць і бяспечнасць выпускаемай прадукцыі — галоўная ўмова і мэта існавання прадпрыемства», — даводзіў пры сустрэчы дырэктар Аляксандр Каламіец.

І ў дасягненні гэтай мэты няма задач другарадных. Узяць хоць бы такую рэч, як забеспячэнне працуючых спецвопраткай. Кожны цэх, кожнае падраздзяленне тут «абмундзіраваны» з-пад іголачкі і пасвойму, форма адрозніваецца нават колерам. Для ўдзельнікаў мясатлушчавых аперацый, напрыклад, яна пашыта з воданепранікальнай тканіны, для мясаперапрацоўшчыкаў — з іншай. Па спецадзенню можна вызначыць, хто дзе працуе, і што ён, калі такое, скажам, здарылася, знаходзіцца не на тэрыторыі свайго цэха. А ў калектыве ж звыш 1200 чалавек.

«Адзявае» іх спецыяльна створаны швейны ўчастак, які займаецца выкрайкай і пашывам халатаў, камбінезонаў, курток, іншай рабочай вопраткі, згодна з графікам вядзе яе замену.

У 2004 годзе прадпрыемства сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням СТБ ІСО 9001-2001. Гэтай абставіне падпарадкавана Палітыка ў сферы якасці, ці пералік асноўных мэтаў і задач, якія павінны дасягацца і ажыццяўляцца на прадпрыемстве як цэласнай адзінцы, так і на асобным рабочым месцы. Выкананне Палітыкі разглядаецца як частка важнейшых абавязкаў персаналу, адказнасці кожнага ў межах сваіх паўнамоцтваў за выкананне якасных параметраў.

Укараненне сістэмы менеджменту якасці і атрыманне сертыфіката з'явілася сведчаннем сталасці прадпрыемства як партнёра на рынку збыту.

Сёлета вытворчасць сертыфікавана на адпаведнасць міжнароднай сістэме кіравання якасцю і бяспекай (НАССР), хутка павінны атрымаць афіцыйны дакумент. Сутнасць яе — у выяўленні кантрольных крытычных пунктаў (кропак) у тэхналагічным працэсе, гарантуючых спажыўцу якасны прадукт.

У дасягненні гэтых і іншых задач мясцовыя тэхналагі цесна супрацоўнічаюць з НДІ мясной і малочнай прамысловасці НАН Беларусі, у прыватнасці, з аддзелам функцыянальных мясных прадуктаў.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

У перадсвяточныя дні мінчане і госці сталіцы маюць магчымасць наведаць фірменную краму слуцкага мясакамбіната. Размясцілася гандлёвая ўстанова на вуліцы Мендзялеева, 25. Гэты здымак знаёміць з супрацоўнікамі новага магазіна Наталляй ЛЕАНОВІЧ, Алай УРУБЛЕЎСКАЙ, Аленай МАРЦІНОВІЧ, Кацярынай МЕРЗЛІКОВАЙ.

Аб прымяненні ўказа Прэзідэнта Беларусі аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 18 снежня падпісаў Указ № 729 «Аб прымяненні Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 396».

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара, дакумент выдадзены ў мэтах забеспячэння аднастайнага прымянення палажэнняў Указа ад 15 чэрвеня 2006 г. № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў» з улікам меркавання зацікаўленых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

Так, пункты 1—3 новага ўказа аднастайна растлумачваюць забудоўшчыкам і іншым зацікаўленым межы дзеяння ўказа № 396, якая запазычанасць забудоўшчыка па падатковых плацяжах не прыводзіць да яго адказнасці па гэтаму ўказу, іншыя правілы надыходу адказнасці.

Раней указ № 396 устанавіў, што грамадзяне і арганізацыі вызваляюцца ад выплаты дзяржаўнай пошліны з іскавых заяў, заяў і скаргаў, што падаюцца ў суды і органы пракуратуры ў сувязі з заключэннем, выкананнем або спыненнем дагавораў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва. У мэтах забеспячэння аднастайнай практыкі прымянення гэтай нормы і зніжэння колькасці неўрэгуляваных спрэчак у галіне долевага будаўніцтва, забеспячэння своечасовага прыцягнення вінаватых да адказнасці пункт 4 новага ўказа растлумачвае, што такая льгота пашыраецца на ўсе спрэчкі, звязаныя з долевым будаўніцтвам, а не толькі на дагаворы, якія заключаюцца пасля выдання ўказа № 396.

У адпаведнасці з указам № 396 забудоўшчык не мае права аказваць перавагу адной асобе перад іншай адносна заключэння дагавора, акрамя выпадкаў, прадугледжаных законамі або рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Тым самым забяспечваецца раўнапраўе дольшчыкаў. Разам з тым для стварэння больш прывабных умоў грамадзянам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пункт 5 новага ўказа замацоўвае права выканкамаў вызначаць пры будаўніцтве кожнага дома катэгорыі асоб, якім павінна аддавацца перавага пры заключэнні дагавораў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва.

Указ № 396 дае магчымасць забудоўшчыкам заключаць дагаворы з юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі не раней як за трыццаць дзён пасля выхаду ў свет дзяржаўнага друкаванага выдання, што змяшчае праектную дэкларацыю з інфармацыяй аб будаўніцтве дома. На працягу гэтых 30 дзён павінны быць заключаны дагаворы з фізічнымі асобамі, якія маюць прыярытэт у заключэнні дагавораў. У сувязі з гэтым пункт 6 новага ўказа растлумачвае, што абмежаванні ўказа № 396 для юрыдычных асоб не пашыраюцца на грамадзян, якія з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, калі яны заключылі дагаворы з забудоўшчыкам выключна для асабістых, бытавых, сямейных і іншых патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, што непасрэдна павінна называцца ў дагаворах. Гэта ўдакладненне будзе садзейнічаць забеспячэнню жыллёвых правоў грамадзян, якія з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у тым ліку тых, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Ва ўказе № 396 устаноўлена забарона на адчужэнне юрыдычнымі асобамі аб'ектаў долевага будаўніцтва на працягу трох гадоў пасля іх набыцця, акрамя продажу мясцоваму выканаўчаму і распарадчаму органу па цане не большай за цану дагавора, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Для вырашэння пытання забеспячэння жыллём работнікаў дзяржаўных арганізацый пункт 7 новага ўказа дазваляе ўсім дзяржаўным арганізацыям да заканчэння названага тэрміну рэалізоўваць гэтыя аб'екты сваім работнікам і прыраўнаваным да іх асобам.

Указ № 396 замацаваў, што цана аб'екта долевага будаўніцтва ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб вызначэнні кошту будаўніцтва будынкаў і збудаванняў і складання каштарыснай дакументацыі з прымяненнем рэсурсна-каштарысных нормаў і з'яўляецца адзінай для ўсіх дольшчыкаў, калі іншае не прадугледжана рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Разам з тым пункт 8 новага ўказа растлумачвае, што ў адпаведнасці з заканадаўствам цана аб'ектаў долевага будаўніцтва для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, можа адрознівацца ад цэн гэтых аб'ектаў для іншых грамадзян.

У сувязі з тым, што многія забудоўшчыкі перадаюць аб'екты долевага будаўніцтва ў карыстанне грамадзянам да набыцця імі права ўласнасці на такія аб'екты, у тым ліку для самастойнай унутранай адзелкі памяшканняў дольшчыкамі, у пункце 9 новага Указа вызначаюцца правілы такой перадачы (заключэнне пісьмовых дагавораў арэнды, найму, перадача ключоў і г.д.) і аплаты пры гэтым камунальных паслуг. Указ № 396 непасрэдна такіх правіл не замацоўваў, даючы магчымасць забудоўшчыкам і дольшчыкам вырашаць адпаведныя пытанні самастойна ў рамках дадатковых умоў дагавораў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва.

Указ № 396 прадугледжвае прымяненне заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў да адносінаў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва. У сувязі з гэтым у пункце 10 новага ўказа ўдакладняюцца правілы прад'яўлення спажыўцамі патрабаванняў аб абароне сваіх правоў і паведамляецца, што заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў прымяняецца да канкрэтных тавараў або работ (паслуг), якія былі выкарыстаны або выкананы (аказаны) у працэсе будаўніцтва аб'екта долевага будаўніцтва, зыходзячы з кошту такіх тавараў, работ (паслуг) і іх адпаведнасці праектнай дакументацыі, а не з кошту ўсёй кватэры. Гэта выклікана тым, што віна ў адсутнасці належнай якасці можа ляжаць не толькі на забудоўшчыку, але і на яго контрагентах, якім ён можа ў далейшым таксама прад'яўляць іскі ў межах кошту такіх тавараў, работ (паслуг).

Ва ўказе № 396 прадугледжана, што ўступка дольшчыкам патрабавання па дагавору аб стварэнні аб'екта долевага будаўніцтва або перавод доўгу на новага дольшчыка дапускаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам да дня падпісання акта прыёмкі-перадачы аб'екта долевага будаўніцтва, калі іншае не ўстаноўлена рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У мэтах выключэння гандлю правамі на заключэнне дагавораў долевага будаўніцтва пункт 11 новага ўказа канкрэтызуе пералік асоб, якім магчыма ўступка дольшчыкам права патрабавання па дагавору долевага будаўніцтва або перавод доўгу. Такімі новымі дольшчыкамі могуць быць бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя (удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабуля, унукі, а таксама жонка (муж) дольшчыка, дзяржава ў асобе ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў, калі іншае не будзе прадугледжана рашэннямі кіраўніка дзяржавы.

Кар. БЕЛТА.

Пенсіі па інваліднасці і па прычыне страты карміцеля з-за аварыі на ЧАЭС будуць вылічацца па-новаму

Для вылічэння памеру пенсій па інваліднасці і па прычыне страты карміцеля, што выкліканы катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, будзе прымяняцца велічыня сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы. Адпаведная норма змешчана ў дэкрэце № 19 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 красавіка 1999 года № 21», які 18 снежня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Дакумент выдадзены ў мэтах прывядзення асобных палажэнняў дэкрэта ад 29 красавіка 1999 года № 21 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванню пенсіённага забеспячэння грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» у адпаведнасць са змененым заканадаўствам.

У адпаведнасці з указам № 21 прымянялася велічыня сярэдняй заработнай платы рабочых і служачых. Аднак велічыня сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы — больш аб'ектыўны паказчык.

Неабходнасць такой карэкціроўкі абумоўлена тым, што ў адпаведнасці з новым пенсіённым заканадаўствам, якое ўступіла ў сілу з 1 жніўня 2006 года, прымяняецца велічыня сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы пры вылічэнні памеру працоўных пенсій.

Такім чынам, устанаўліваецца аднастайны падыход да вылічэння ўсіх працоўных пенсій з прымяненнем велічыні сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Віншаванні

Віншуем ***Раісу Васільеўну БУДЗЬКО*** *з в. Кіржына Мядзельскага раёна з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя і поспехаў у працы на сваёй сядзібе.*

Сястра Ліна і яе сям'я,
в. Краснае.

Віншуем з днём нараджэння паважаную ***Алену Віктараўну ПЯТРОВІЧ*** *з в. Залужка Стаўбцоўскага раёна. Ад усёй душы жадаем быць багатай на жаночае шчасце, здароўя, дабрабыту ў сям'і.*

Калегі.

Віншуем ***Валянціну Віктараўну ПРУТКОВУ*** *з юбілеем. Жадаем здароўя і шчасця багата, хваробы ніякай не ведаць ніколі. Пражыць гадоў сотню, а можа і болей.*

Калегі, *г. Новалукомль.*

Сардэчна віншуем з днём нараджэння ***Надзею Уладзіміраўну КУЛАКОВУ*** *з в. Даманавічы. Любая матуля, жадаем моцнага здароўя, дабрабыту і доўгіх гадоў жыцця.*

Дзеці, унукі.

«ЗВЯЗДА» Ў САЮЗЕ З ПАШТАВІКАМІ

Паважаныя работнікі паштовай сувязі! Рэдакцыя газеты «Звязда» мае даўнія партнёрскія сувязі з паштавікамі, якія традыцыйна з'яўляюцца добрымі памочнікамі падчас падпісной кампаніі на старэйшае беларускамоўнае выданне.

Нам хацелася б удасканаліць прынцып узнагароджання раённых вузлоў паштовай сувязі, аддзяленняў сувязі і паштальёнаў за актыўны ўдзел у падпісцы на газету «Звязда» на 1-ы квартал і І паўгоддзе 2007 года і ўстанавіць адпаведны прызавы фонд у наступных намінацыях ва ўсіх абласцях і горадзе Мінску.

Сярод раённых вузлоў паштовай сувязі
1-е месца — 8 базавых велічынь;
2-е месца — 7 базавых велічынь;
3-е месца — 5 базавых велічынь
Сярод аддзяленняў сувязі
1-е месца — 6 базавых велічынь;
2-е месца — 5 базавых велічынь;
3-е месца — 3 базавыя велічыні.
Сярод паштальёнаў
1-е месца — 4 базавыя велічыні;
2-е месца — 3 базавыя велічыні;
3-е месца — 2 базавыя велічыні

Спадзяёмся, што новы фармат у прэміраванні лепшых супрацоўнікаў паштовай сувязі на падпіску на газету «Звязда» будзе больш справядлівым і паслужыць павелічэнню чытацкай аўдыторыі на старэйшае ў краіне, адзінае штодзённае беларускамоўнае выданне, якому ў наступным годзе споўніцца 90 гадоў.

Дзякуй!

«МЫ ПАСТАРАЕМСЯ...»

Мы, пенсіянеры з вёскі Гаішча Хацежынскага сельсавета, хацелі б усім расказаць, як у нас працуе пошта. Кіруе ёй Валянціна Анатольеўна Шабан, а непасрэдна да нас, і, лічы, штодня, прыходзіць паштальён Ала Валянцінаўна Рабсава — прыносіць газеты, розныя тавары... Любяць яны людзей, любяць сваю работу. Закажаш што-небудзь — абавязкова прывязуць, папросіш — зробяць. Няёмка бывае: ведаеш, што не іх гэта справа, але ніколі і ні ў чым яны нам не адмовілі. Кажуць: «Мы высветлім», «Мы пастараемся зрабіць» і потым абавязкова зробяць. Ні разу не было, каб нешта забыліся!

Карацей — паважаем мы іх, заўсёды чакаем і думаем, як добра было б, каб усюды і ўсе да сваёй работы ставіліся вось гэтак?!

Па даручэнню вёскі пісала А.І. ЛЯДНІЦКАЯ, *Мінскі раён.*

Чаму я выпісваю «Звязду»?

«...БО ЎСЁ Ў ЁЙ ПАТРЭБНАЕ»

Не прыпомню ўжо, колькі гадоў сябрую з газетай: выпісвала, калі працавала, выпісваю і цяпер, пайшоўшы на пенсію. Падабаецца, што яна — на роднай мове, што вялікая — шмат старонак, цікавых укладак.

Матэрыялы, змешчаныя пад рубрыкай «Радзіннае» — ад нараджэння чалавека да праводзінаў у лепшы свет — сабрала ў асобную папку, каб перадаць потым дачцэ ці ўнучцы... Люблю «Хатнюю энцыклапедыю», «Крынічку», «Ёсць рэцэпцік!», хоць, здавалася б, багата і ўласнага вопыту... (А, мо, таму і багата?). Заўсёды і вельмі ўважліва чытаем з мужам «Прамыя лініі». Асабліва — з людзьмі ў белых халатах, бо здароўя якраз не хапае. Да таго ж гаспадар мой цікавіцца пенсійнымі пытаннямі, любіць чытаць «пра жыццё».

Карыстаемся мы і праграмай тэлебачання, календарамі, што прапануе газета: звычайным (на год) і месяцавым...

Карацей, «Звязда» — гэта наша выданне. Выпісваем заўсёды і адразу на паўгода. Чытаем ад першых радкоў да апошніх. Бо ўсё ў ёй патрэбнае!

Ганна РЫНКЕВІЧ, *в. Трабы, Іўеўскі раён.*

КРЭДЫТЫ БУДУЦЬ ТАННЕЦЬ...

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае першы намеснік старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Юрый АЛЫМАЎ

(Працяг. Пачатак у нумары за 19 снежня.)

— Ужо зацверджаны Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі на наступны год. Прагназуецца, што інфляцыя да канца 2007 года знізіцца да 6—8 працэнтаў. За кошт якіх фактараў будзе дасягнуты такі паказчык?

— Інфляцыя — гэта складаная і шматфактарная з'ява, яе ўзровень залежыць ад працэсаў, што адбываюцца ва ўсіх сектарах эканомікі краіны. Пагэтаму зніжэнне інфляцыі да ўзроўню 6—8 працэнтаў, прадугледжанага Прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця і асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2007 год, плануецца забяспечыць сумесна як мерамі грашова-крэдытнай палітыкі, так і мерамі агульнаэканамічнай палітыкі ўрада Беларусі.

Манетарныя фактары зніжэння інфляцыі будуць забяспечвацца правядзеннем збалансаванай грашова-крэдытнай палітыкі. Сярод яе мераў, перш за ўсё, трэба назваць стабільнасць курса беларускага рубля. Стабільнасць абменнага курса абмяжоўвае тэмпы росту цэн на імпартныя тавары, што становіць адбіваецца на зніжэнні тэмпаў усёй інфляцыі. Акрамя таго, працяглае падтрыманне ўстойлівасці абменнага курса з'яўляецца важнейшым фактарам адсутнасці інфляцыйна-дэвальвацыйных чаканняў у прадпрыемстваў і насельніцтва.

Немалаважнае значэнне ў комплексе мераў, процідзеючых інфляцыі, будзе мець і ўзмацненне ролі працэнтнай палітыкі. Падтрыманне працэнтных ставак па дэпазітах насельніцтва і прадпрыемстваў на рэальным станоўчым узроўні, гэта значыць вышэй узроўню інфляцыі, будзе садзейнічаць замаруджванню росту цэн, паколькі значная частка грашовых даходаў насельніцтва будзе прыцягнута банкамі і накіравана на развіццё вытворчасці, якое дазволіць павялічыць продаж тавараў і аб'ём паслуг.

Важным фактарам зніжэння інфляцыі застанецца змяншэнне інфляцыйных чаканняў прадпрыемстваў і насельніцтва, якое абумоўлена ростам даверу да грашова-крэдытнай палітыкі, якая праводзіцца. Калі прадпрыемствы і насельніцтва ўпэўнены, што цэны не павысяцца, то вытворцы і прадаўцы тавараў не імкнуцца ні «прытрымаць» тавар на складах да моманту, калі цэны стануць вышэй, ні закласці чакаемыя будучыя страты ад інфляцыі ў цяперашнюю цану. У сваю чаргу, у пакупнікоў няма стымулу набываць тавар «у запас». Усё гэта павышае ўстойлівасць спажывецкага рынку краіны і садзейнічае стабільнасці цэн.

Неманетарныя фактары зніжэння інфляцыі забяспечваюцца ўстойлівым і збалансаваным развіццём эканомікі краіны, у тым ліку павелічэннем аб'ёмаў вырабляемых тавараў і паслуг, тэхнічным пераўзбраенне прадпрыемстваў з мэтай зніжэння затрат на вытворчасць, стварэннем новых працоўных месцаў і павышэннем прадукцыйнасці працы. Стрымліванню росту цэн будуць спрыяць збалансаванасць дзяржаўнага бюджэту, умацаванне фінансавага стану прадпрыемстваў і павышэнне эфектыўнасці іх працы, адпаведнасць тэмпаў павышэння даходаў насельніцтва тэмпам росту прадукцыйнасці працы, зніжэнне энергаёмістасці і матэрыялаёмістасці вытворчасці.

Важным антыінфляцыйным фактарам стане забеспячэнне станоўчага сальда знешняга гандлю, гэта значыць краіна прадасць за мяжу больш айчынных тавараў і паслуг, чым закупіць замежных. Гэта забяспечыць прыток неабходнага аб'ёму замежнай валюты ў эканоміку Беларусі, а таксама дазволіць павялічыць золатавалютныя рэзервы краіны.

— Галоўны банк краіны ўжо які год вытрымлівае палітыку, пры якой укладыў нацыянальнай валюце застаюцца больш прывабнымі. Ці будзе нешта мяняцца ў далейшым?

— Адна з важнейшых мэтаў дзейнасці Нацыянальнага банка, зафіксаваная ў Банкаўскім кодэксе Беларусі, — абарона і забеспячэнне ўстойлівасці беларускага рубля. Дасягненне гэтай мэты, сярод іншых мераў, мае на ўвазе высокую прывабнасць беларускага рубля як сродку зберажэння. Па гэтай прычыне Нацыянальны банк пры правядзенні працэнтнай палітыкі пастаянна ўлічвае два важныя фактары прывабнасці беларускага рубля.

Па-першае, каб уклад у беларускіх рублях даваў магчымасць зберагчы сродкі ад інфляцыйнага абясцэньвання, працэнтная стаўка павінна быць станоўчай у рэальным выражэнні, гэта значыць перавышаць узровень інфляцыі. Калі працэнт большы за інфляцыю — значыць, на суму, вернутую банкам з працэнтамі, па заканчэнні тэрміну ўкладу ўкладчык зможа купіць больш тавараў, чым на першапачатковую суму ўкладу ў дзень, калі ён паклаў сродкі ў банк, і банкаўская сістэма выканае задачу захавання сродкаў ад абясцэньвання.

Па-другое, нацыянальная валюта павінна мець у краіне больш высокую прывабнасць, чым замежная. Гэта дазваляе паступова зніжаць патрэбы нашай эканомікі ў замежнай валюце, памяншаць неапраўданы ціск на валютны рынак і ў цэлым павышаць эфектыўнасць грашова-крэдытнай палітыкі шляхам росту долі беларускіх рублёў у грашовым абароце краіны — гэты працэс называецца дэдалярызацыяй. Таму да ўвагі таксама прымаецца параўнальная даходнасць укладаў у рублях і замежнай валюце. Працэнтная стаўка па рублёваму ўкладу павінна прынесці ўкладчыку большы даход, чым захаванне валютнага ўкладу. Так, у кастрычніку 2006 года працэнтная стаўка па тэрміновых рублёвых дэпазітах была ў 1,6 раза вышэй, чым даходнасць па валютных дэпазітах.

Такі падыход да даходнасці рублёвых дэпазітаў паслядоўна рэалізуецца Нацыянальным банкам ужо на працягу некалькіх гадоў. Ён апраўдвае сябе, што пацвярджаецца дасягнутымі тэмпамі росту дэпазітаў, і можа быць захаваны і далейшым. Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі на 2007 год прадугледжваюць, што і ў наступным годзе адным з базавых прынцыпаў працэнтнай палітыкі будзе падтрыманне працэнтных ставак на ўзроўні, які спрыяе росту зберажэнняў у нацыянальнай валюце.

Ігар ШЧУЧЭНКА.
(Працяг будзе.)

Не заплаціш — не дакажаш?

Жыхарам сталіцы, якім патрэбна даведка аб адсутнасці альбо наяўнасці судзімасці ці крымінальнага пераследу, неабходна паспяшацца ў інфармацыйна-аналітычнае ўпраўленне ГУУС Мінгарвыканкама.

Як паведаміла «Звяздзе» спецыяльны карэспандэнт аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў сталічнай міліцыі Анжэліка Гурыновіч, толькі да канца гэтага года памянёная вышэй даведка будзе выдавацца бясплатна. А ўжо з 1 студзеня 2007 года адпаведны дакумент будзе каштаваць палову базавай велічыні. У выпадку, калі грамадзяніну такая даведка спатрэбіцца тэрмінова, то давядзецца раскашэліцца на адну «базавую».

Паводле звестак сталічнай міліцыі, сёлета згаданыя даведкі атрымалі больш за 5 тысяч грамадзян. Звычайна, мінчане прасілі выдаць такі дакумент пры выездзе на пастаяннае месца жыхарства за мяжу альбо пры працаўладкаванні, прычым нават у нашай краіне. Многія айчынныя арганізацыі і ўстановы зараз вельмі прыдзірліва падбіраюць кадры, патрабуючы ад кандыдатаў на вакантныя пасады дакументальных доказаў адсутнасці судзімасці ці крымінальнага пераследу.

У Галоўным упраўленні унутраных спраў сталіцы адзначылі, што працэс атрымання даведкі займае не больш як 15 дзён, а ў тэрміновым парадку — 3 дні. Прыём грамадзян ажыццяўляецца ў будынку па вуліцы Свярдлова 24 «А», у сераду з 11 да 15 і з 16 да 20 гадзін, а таксама ў суботу з 9 да 13 гадзін. Даведка выдаецца асабіста ў рукі заяўніку. Каб запрасіць адпаведны дакумент для іншай асобы, патрэбна натарыяльна заверэная даверанасць і копія пашпарта чалавека, якому патрэбна даведка. Грамадзяне Беларусі, якія пражываюць за мяжой, для атрымання гэтага дакумента павінны звярнуцца ў консульства ці амбасаду нашай краіны.

Дадатковую інфармацыю наконт парадку выдачы памянёнага дакумента можна атрымаць па тэлефонах у Мінску 229-40-27, 229-46-66.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Літаратурная анкета «Звязды»

«Пачуццё Радзімы павінна асвятляць кожны радок...»

1. Якой вам бачыцца будучыня беларускай літаратуры?

2. Хто, на ваш погляд, вызначае сёння аблічча беларускай літаратуры: у прозе, у паэзіі, у драматургіі, у літаратурнай крытыцы?

3. Хто ён, герой нашага часу — з пункту гледжання пісьменніка?

Уладзімір КАРЫЗНА, паэт:

1. У нас зайздросная для многіх літаратур свету спадчына: Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, К. Крапіва, М. Танк, І. Мележ, І. Шамякін... Думаю, гэта спадчына працуе на будучыню. Веру, што напярэдзе — яркая старонка айчыннай літаратуры.

2. У сучаснай літаратуры ёсць яркія імёны, якія ў творчасці арыентуюцца на класічныя крытэрыі. Для каго мы пішам? Так, для народа. Пачуццё Радзімы павінна асвятляць кожны радок наш, без гэтага святога пачуцця няма творцы. Люблю паэзію Андрэя Скарынкіна, гэта адзін з самых лепшых сучасных паэтаў. Назаву Віктара Гардзея, Змітрака Марозава, Міхася Пазнякова, Казіміра Камейшу, Валянціну Паліканіну, Міхася Башлакова з яго чарнобыльскім болем (хоць, можа, часам залішне раскаваным і эмацыянальным), маладога Андрэя Цяўлоўскага — вельмі яркага, вострага па думцы, таленавітага паэта і перакладчыка. Для мяне шмат значыць драматургія Васіля Ткачова і Георгія Марчука. А сярод даследчыкаў літаратуры, крытыкаў — акадэмік Уладзімір Гніламёдаў.

3. Героі нашага часу — пакуль толькі на «Дажынках». Таго новага героя нашага жыцця, якога мела на ўвазе «Звязда», задаючы пытанне, імкнуўся намаляваць у сваіх аповесцях і раманах пасля перабудовы народны пісьменнік, незабыўны Іван Пятровіч Шамякін. Але ўсе гэтыя героі, як прызнаваўся пісьменнік у дзённіках, — героі адмоўныя. Думаю, можа пакуль што — адмоўныя, а потым з'явяцца і іншыя?..

Падрыхтавала Таццяна ПАДАЛЯК.

ЛЯЛЬКУ ТРЭБА ЛЮБІЦЬ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але найперш яе трэба прыдумаць. Вядучы мастак фабрыкі «Слуцкі пояс» Антаніна Ісакава (на фотаздымку) амаль дваццаць гадоў займаецца распрацоўкай арнаментаў і карункаў тканага асартыменту. У тым ліку стварае і сувенірную беларускую ляльку.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

ЗА МАЛАКО РАЗЛІЧАЦЦА Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

З вёскі Аюцавічы Карэліцкага раёна патэлефанавалі малаказдатчыкі: яны ўжо каля месяца не атрымліваюць грошы за здадзеную сельскагаспадарчую прадукцыю, хоць, паводле іх слоў, мясцовы малаказавод, як і належыць, кожныя 10 дзён пералічвае сродкі за малако. Праблема ў тым, што разлікі з насельніцтвам вядуцца праз СВК «Аюцавічы-Агра», а ўсе яго разліковыя рахункі блакіраваны падатковай інспекцыяй.

Галоўны бухгалтар гаспадаркі Марыя Грыб пацвердзіла гэту інфармацыю: так, усе рахункі арыштаваны, паколькі патрабуецца заплаціць падаткі з 16 мільёнаў рублёў. Увогуле, калі кароткa, фінансавае становішча СВК зараз не з лепшых: сёлета валавы збор збожжа склаў толькі 3,5 тысячы тон замест 6 тысяч тон, як было напярэдадні. Таму гаспадарка зараз трымаецца ў асноўным за кошт здачы малака і мяса.

— Канкрэтна за малако насельніцтву мы павінны выплаціць 2 мільёны 900 тысяч рублёў, — патлумачыла Марыя Мікалаеўна. — Дагэтуль мы не маглі заплаціць банку за атрыманне наяўных грошай, аднак сёння (на момант гутаркі. — **С.Р.)** вырашаецца пытанне з мясакамбінатам аб пералічэнні нам грошай. Літаральна з заўтрашняга дня можна будзе атрымаць сродкі. Паколькі доўг перад малаказдатчыкамі адносна невялікі, думаю, мы зможам пагасіць яго цалкам адразу ж пасля пералічэння нам фінансаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Утверждена собранием акционеров
от 15 ноября 2006 года
Протокол № 23

ЗАВЕРЯЮ
Начальник Минской городской инспекции по ценным бумагам В.Н. Омельянович
30 ноября 2006 г.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой подписке на акции дополнительного выпуска открытого акционерного общества «Пивзавод Оливария»

Эмитент: Открытое акционерное общество «Пивзавод Оливария» (ОАО «Пивзавод Оливария») — адкрытае акцыянернае таварыства «Піўзавод Аліварыя» (ААТ «Піўзавод Аліварыя») (далее по тексту — Общество).

Общество создано приказом Минского городского управления госимущества и приватизации от 1 марта 1994 года путем преобразования государственного предприятия «Минский пивзавод «Беларусь» и зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 4 июля 1994 года № 2693. Перерегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 24 ноября 2000 г. № 1348 в Едином государственном регистре юридических лиц № 100128525

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, дом 30. Телефон (017) 234-11-63. Факс (017) 234-11-63. E-mail: info@alivaria.by

Основной целью деятельности Общества является получение прибыли и распределение прибыли между акционерами. Общество осуществляет следующие виды деятельности: производство пива, предоставление услуг ресторанами, предоставление услуг барами. Срок деятельности Общества не ограничен.

Основные показатели финансово-хозяйственной деятельности:

Показатели финансово-хозяйственной деятельности, млн. руб.:	*на 01.01.2006*	*на 01.10.2006*
Основные средства (01,02)	**28 017**	**30 985**
Прибыль от реализации	**3 392**	**4 253**
Нераспределенная прибыль	**307**	**1 277**
Резервный фонд	**200**	**79**
Чистые активы	**31 928**	**33 159**

Ранее обществом проведено две эмиссии акций. Сумма уставного фонда составляет 32 258 699 400 (тридцать два миллиарда двести пятьдесят восемь миллионов шестьсот девяноста девять тысяч четыреста) рублей. Количество акций – 85 660 (восемьдесят пять тысяч шестьсот шестьдесят) штук. Вид и категория – простые именные. Номинальная стоимость акции 376 590 (триста семьдесят шесть тысяч пятьсот девяносто) рублей.

Размер объявленного уставного фонда – 61 444 800 990 (шестьдесят один миллиард четыреста сорок четыре миллиона восемьсот тысяч девятьсот девяносто) рублей.

К открытой подписке предлагаются 77 501 (семьдесят семь тысяч пятьсот одна) именная акция, в том числе 36 711 (тридцать шесть тысяч семьсот одиннадцать) простых и 40 790 (сорок тысяч семьсот девяноста) привилегированных по номинальной стоимости 376 590 (триста семьдесят шесть тысяч пятьсот девяносто) рублей. Сумма дополнительной (третьей) эмиссии акций — 29 186 101 590 (двадцать девять миллиардов сто восемьдесят шесть миллионов сто одна тысяча пятьсот девяносто) рублей.

Акции размещаются следующим образом: подписка на простые именные акции осуществляется пакетами в размере не менее 18 000 (восемнадцать тысяч) штук, на привилегированные акции — одним пакетом в размере 40 790 (сорок тысяч семьсот девяносто) штук.

Решением собрания акционеров предусмотрено преимущественное право акционеров Общества на приобретение дополнительно выпущенных Обществом акций. Преимущественное право акционера действует в течение одного часа с момента начала размещения дополнительно выпускаемых акций первого дня проведения открытой подписки.

Открытая подписка будет проводиться ежедневно с 8 до 15 часов (кроме выходных и праздничных дней) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Машерова, дом 19, приемная генерального директора Общества.

Продолжительность открытой подписки на акции дополнительного выпуска — 165 дней со дня опубликования данной краткой информации.

Подписка прекращается досрочно в случае достижения размера объявленного уставного фонда ранее окончания установленного срока закрытия подписки.

В случае не достижения в ходе подписки объявленного размера уставного фонда фактический его размер утверждается общим собранием акционеров.

Подписка на акции производится путем заключения договора между подписчиком и Обществом, в котором оговорены все условия приобретения и оплаты акций, а также права и обязанности подписчика и Общества.

В подписке может быть отказано в случае ее досрочного прекращения, не предоставления декларации либо экспертного заключения оценки неденежного вклада, передаваемого в счет оплаты за акции.

При отказе от выпуска акций средства, внесенные на приобретение акций, объявленных по подписке, будут возвращены в течение месяца после даты принятия решения об отказе от выпуска акций (запрете проведения открытой подписки).

Денежные средства, поступающие по подписке, будут зачислятся на:

расчетный счет № 3012204820017 филиал ОАО «Белагропромбанк» Минская городская дирекция, код 963;

валютный счет:

BANK KORRESPONDENT Deutsche Bank Trust Company Americas
New York USA SWIFT BKTRUS33
BANK Acc. 04 - 098 – 826 OAO BELAGROPROMBANK BRANCH MINGORDIREKTSIYA
KOD 963 MINSK BELARUS SWIFT BAPBBY2X
Account 3012204825012 Olivaria Brewery JSC 30 Kiseleva str. 220029 Minsk, Belarus
TIN: 100128525

Средства, поступившие на расчетный (валютный) счет Общества в ходе открытой подписки, подлежат аккумулированию и не могут быть использованы Обществом до государственной регистрации акций в Департаменте по ценным бумагам Министерства Финансов Республики Беларусь.

Целью открытой подписки является привлечение денежных средств на проведение полномасштабной реконструкции ОАО «Пивзавод Оливария». Они будут использованы на создание новых производственных мощностей ОАО «Пивзавод Оливария».

Дивиденды выплачиваются из чистой прибыли Общества только по размещенным акциям. Размер дивиденда объявляется в белорусских рублях на одну акцию. По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Дивиденды по привилегированным акциям выплачивают ежегодно в фиксированном размере 1 (один) рубль на одну привилегированную акцию.

С проспектом эмиссии акций ОАО «Пивзавод Оливария» можно ознакомиться ежедневно с 10 до 15 часов (кроме выходных и праздничных дней) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Машерова, дом 19, приемная генерального директора Общества.

Генеральный директор Н.А. Дудко
И.о. главного бухгалтера Т.А. Брингель

ОДО «АЙРОН»
ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОДАЖЕ

одноэтажного кирпичного отдельно стоящего здания гаража с офисными помещениями общей площадью 1055 кв. м, расположенного на земельном участке 0,63 га по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176. Участок выделен в постоянное пользование. Объект продается без условий, под реконструкцию. Возможно многопрофильное использование под производственное, торгово-общественное назначение. Оценочная стоимость объекта — 1 535 000 000 рублей с учетом кадастровой стоимости земельного участка.

Тел.: (8-017) 280-43-60, 8-029-634-76-34.

У суд Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **Волкава Уладзіміра Мікалаевіча,** 20 студзеня 1960 года нараджэння, ураджэнца в. Зазер'е Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці, які пражываў па адрасу: Гомельская вобласць, г. Рагачоў, вул. Леніна, д. 83, кв. 4, апошняе месца знаходжання — г. Масква. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра У.М. Волкава, паведаміць іх суду Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Даслоўна

«ДАІШНІК» — У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПАМОЧНІК»

На пытанні аглядальніка «Звязды» адказвае намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі Яўген Карповіч

— Яўген Леанідавіч, прааналізуйце, калі ласка, сітуацыю на дарогах краіны. Якія тэндэнцыі назіраюцца апошнім часам? Што вас больш за ўсё непакоіць?

— Сёлета Дзяржаўтаінспекцыяй сумесна з іншымі зацікаўленымі арганізацыямі і ўстановамі праведзены шэраг мерапрыемстваў, якія садзейнічалі пэўнай стабілізацыі абстаноўкі на дарогах. Дзякуючы ўкараненню новых сродкаў арганізацыі дарожнага руху, удасканаленню формаў і метадаў прафілактычнай працы за 11 месяцаў гэтага года на 42 чалавекі зменшылася колькасць смяротных ахвяр ДТЗ. Агульнарэспубліканскі каэфіцыент цяжкасці наступстваў дарожна-транспартных здарэнняў (суадносіны колькасці загінулых на 100 аварый) зменшыўся з 17,2 да 16. Таксама зменшылася колькасць ДТЗ з удзелам нецвярозых вадзіцеляў, што, на маю думку, стала вынікам жорсткіх мераў, якія мы прымяняем да аматараў выпіць за рулём.

Разам з тым сітуацыя на дарогах застаецца вельмі трывожнай. Павялічылася агульная колькасць аварый, больш цяжкімі сталі іх наступствы. Многія вадзіцелі, на жаль, так і не навучыліся правільна паводзіць сябе за рулём аўтамабіля: перавышаюць хуткасць, парушаюць правілы манеўравання і праезду перакрыжаванняў, пешаходных пераходаў, выязджаюць на палосу сустрэчнага руху. А верхнія радкі ў гэтым своеасаблівым «рэйтынгу недысцыплінаванасці» сёлета занялі асобы, якія кіравалі транспартным сродкам не маючы правоў і рэгістрацыйных дакументаў, а таксама ўцекачы з месца здарэння.

Вельмі непакоіць нас і рост колькасці аварый па віне пешаходаў.

— Ці задаволена ДАІ станам беларускіх дарог?

— У цэлым тэхніка-эксплуатацыйны стан аўтамабільных дарог Беларусі ў параўнанні з іншымі дзяржавамі постсавецкай прасторы можна ацаніць станоўча.

Дзяржаўтаінспекцыя сумесна з арганізацыямі дарожнай гаспадаркі прымае меры для павышэння бяспекі на магістралях. У прыватнасці, штогод распрацоўваюцца адпаведныя праграмы, у выніку рэалізацыі якіх павялічваецца колькасць асвятляемых участкаў дарог у населеных пунктах, абсталёўваюцца належным чынам пешаходныя пераходы, веласіпедныя дарожкі, з'яўляюцца наземныя і падземныя пераходы ў месцах інтэнсіўнага руху транспарту, пашыраюцца праезныя часткі. Праўда, з-за адсутнасці сродкаў не ўсе нашы пажаданні па паляпшэнню якасці і бяспечнасці дарог выконваюцца. Таму кіраўніцтва МУС накіравала ў Міністэрства транспарту і камунікацый інфармацыю аб участках дарог з найвялікшай канцэнтрацыяй ДТЗ. Менавіта на паляпшэнне дарожных умоў у такіх месцах у першую чаргу будуць выдзяляцца сродкі.

— А колькі на нашых дарогах самых аварыйных месцаў?

— Паводле інфармацыі дэпартамента «Белаўтадар», па стану на 1 студзеня гэтага года на рэспубліканскіх дарогах налічвалася больш за 560 участкаў найбольшай канцэнтрацыі ДТЗ. На жаль, колькасць такіх месцаў павялічылася, нягледзячы на пастаянную працу дарожных службаў, накіраваную на паляпшэнне якасці дарогі і павышэнне бяспекі.

— Я чуў, што нават святары прыязджалі на асобныя «зачараваныя ўчасткі», каб прагнаць «нячыстую сілу». Ці дало гэта нейкі станоўчы эфект?

— Падобныя факты былі. Але ДАІ не мае статыстычных звестак наконт эфектыўнасці такіх спосабаў павышэння бяспекі ў аварыйных месцах.

Я асабіста лічу, што дзеля прадухілення ДТЗ трэба выкарыстоўваць усе магчымыя меры, у тым ліку і, скажам так, нестандартныя, бо на карту пастаўлена жыццё і здароўе людзей.

— А наколькі была апраўдана «палітыка бізуна і перніка» ў адносінах да вадзіцеляў, якія здзяйснялі дробныя парушэнні? За непрышпілены рэмень бяспекі ці размову па «мабільніку» да нядаўняга часу «даішнікі» рабілі толькі заўвагу. Цяпер жа бязлітасна штрафуюць. Больш таго, неўзабаве адміністрацыйнае пакаранне за гэтыя парушэнні мацней ударыць па кішэні вадзіцеляў.

— Я не згодзен, што праводзімая намі праца — гэта «палітыка бізуна і перніка». Так, некалькі гадоў таму мы пачалі «ліберальней» ставіцца да дробных парушальнікаў, рабілі большы ўпор на тлумачальную работу, хоць і ад практыкі прыцягнення да адказнасці зусім не адмаўляліся. Тое, што апошнім часам мы пачалі больш жорстка караць за размовы па мабільным тэлефоне і непрышпілены рэмень бяспекі, абумоўлена самой складанай сітуацыяй на дарогах. Заўважце, Дзяржаўтаінспекцыя напачатку праз сродкі масавай інфармацыі патлумачыла сутнасць праблемы, сумленна папярэдзіла вадзіцеляў, што не будзе глядзець скрозь пальцы на памянёныя парушэнні. Наўрад ці сёння знойдзецца вадзіцель, які не чуў пра акцыю «Прышпіліся!». І калі да гэтага часу ён не хоча сам паклапаціцца пра сваё жыццё і здароўе, бяспеку пасажыраў, то мы абавязаны прымусіць яго гэта зрабіць, у тым ліку і з дапамогай штрафных санкцый. Паводле нашых падлікаў, сёлета больш за 300 чалавек засталіся б жывымі ў выніку ДТЗ, калі б скарысталіся рамянямі бяспекі. А колькі пешаходаў дайшлі б дадому, калі б абазначылі сябе святлоадбівальнымі элементамі! І гэта якраз тыя выпадкі, у якіх дзеля выратавання жыцця чалавека не патрабуюцца вялікія матэрыяльныя выдаткі.

— Раскажыце больш падрабязна аб сістэме налічэння штрафных балаў, якую прапануе ўвесці ДАІ. У прыватнасці, як будуць ацэньвацца парушэнні, назавіце «крытычны парог» балаў, пасля якога вадзіцеля аўтамабільна пазбавіць правоў?

— Бальная сістэма яшчэ знаходзіцца на стадыі распрацоўкі. У МУС створана міжведамасная рабочая група, у якую апроч супрацоўнікаў органаў унутраных спраў уваходзяць таксама спецыялісты з Вярхоўнага Суда, Пракуратуры Беларусі і Міністэрства юстыцыі. Канцэптуальна ўсе яны пагадзіліся, што альтэрнатывы бальнай сістэме няма. Яна, дарэчы, паспяхова функцыянавала ў СССР да 1959 года, толькі тады называлася «папярэджваннем шляхам выканання кампосцерных прасечак» адмысловага талона. Якой будзе бальная сістэма ў Беларусі, стане вядома пасля яе канчатковага зацвярджэння і ўступлення ў сілу.

Пакуль што магу толькі сказаць, што ў яе аснову пакладзены тры галоўныя прынцыпы.

Першы прынцып сцвярджае, што кіраванне транспартным сродкам з'яўляецца прывілеяй, а не неад'емным канстытуцыйным правам грамадзяніна.

Другі прынцып канстатуе, што сістэма ацэнкі і ўліку парушэнняў Правілаў дарожнага руху (ПДР) з дапамогай вядзення статыстыкі папярэджванняў прызначана для выяўлення пастаянных парушальнікаў, а таксама дзеля абароны законапаслухмяных вадзіцеляў і пешаходаў. Вобразна кажучы, сістэма будзе арыентавана на ачышчэнне нашых дарог ад вадзіцеляў, якія пастаянна і шматразова парушаюць ПДР. Законапаслухмяным вадзіцелям альбо тым, хто выпадкова трапіць у спіс парушальнікаў, асцерагацца няма чаго. Нязначныя і рэдкія парушэнні ПДР праз некаторы час будуць спісвацца.

І, нарэшце, трэці, «заахвочвальны» прынцып. Паводле яго, вадзіцелям, якія парушаць ПДР, будзе прапанавана прайсці курсы па вывучэнню асноў бяспекі дарожнага руху. Такім чынам яны атрымаюць магчымасць усвядоміць свае памылкі і пачаць па-іншаму ставіцца да выканання ПДР, што дасць магчымасць у далейшым пазбегнуць рэцыдываў небяспечных паводзінаў на дарозе.

— Хутка споўніцца роўна год з моманту ўступлення ў сілу новых Правілаў дарожнага руху. Наколькі эфектыўнымі аказаліся новыя ПДР? Ці трэба іх удасканальваць?

— Кожныя правілы эфектыўныя толькі тады, калі яны выконваюцца. Ужо сціхлі спрэчкі наконт таго, дрэнныя ці добрыя дзеючыя зараз ПДР. Вядома ж, няма мяжы дасканаласці. Але гэта не азначае, што ў новыя Правілы трэба тэрмінова ўносіць змены. Хоць у іх ёсць пэўныя недакладнасці, так бы мовіць, рэдакцыйнага характару. Але адпаведныя змяненні і дапаўненні лепш будзе ўнесці пры ўвядзенні новых дарожных знакаў альбо іншых патрабаванняў, якія выцякаюць з міжнародных абавязкаў Рэспублікі Беларусь у сферы дарожнага руху і забеспячэння яго бяспекі.

— А ці праўда, што ДАІ выступіла з ініцыятывай увядзення для вадзіцеляў пластыкавых медыцынскіх даведак? Калі так, то чаму?

— Мы не настойваем на тым, каб медыцынскія даведкі былі менавіта пластыкавыя. Не мае значэння з якога матэрыялу гэтыя дакументы будуць выраблены. Галоўнае, каб яны былі абароненыя ад падробкі, персаніфікаваныя і аднесеныя да бланкаў строгай справаздачнасці. Дзеля чаго гэта патрэбна? Справа ў тым, што апошнім часам кожная паліклініка, якая мае ліцэнзію на правядзенне адпаведнага медагляду вадзіцеляў і курсантаў аўташкол, сама вызначае ўзор бланкаў даведак. У выніку, узнік цэлы набор такіх дакументаў, на якіх, дарэчы, не тое што ступеняў абароны ад падробкі няма, але і нават фотаздымак уладальніка адсутнічае, што значна абцяжарвае кантроль за іх сапраўднасцю. А кантроль, і прычым вельмі жорсткі, за станам здароўя вадзіцеля проста жыццёва неабходны, паколькі аўтамабіль з'яўляецца сродкам павышанай небяспекі. Таму МУС звярнула ўвагу Міністэрства аховы здароўя на мэтазгоднасць змянення дзеючых нарматыўных актаў, якія рэгламентуюць выдачу памянёных даведак.

— Нядаўна прачытаў у Інтэрнэце паведамленне, што ўлады Кракава ўвялі новую сістэму захвочвання працы тамтэйшых паліцэйскіх: чым больш штрафаў выпіша вартавы дарожнага парадку, тым саліднейшая ў яго будзе прэмія. Ці існуе такая ўзаемасувязь пры аплаце работы беларускага «даішніка»? Увогуле, па якіх крытэрыях ацэньваецца работа супрацоўніка ДАІ нашай краіны?

— Не, такой сістэмы заахвочвання ў Дзяржаўтаінспекцыі Беларусі няма. Ніякіх планаў па выяўленню парушэнняў Правілаў дарожнага руху інспектарам мы не даводзім. Перад нашымі супрацоўнікамі пастаўлены іншыя задачы. «Даішнік» — у першую чаргу памочнік. Наша галоўная мэта — не пакараць вадзіцеля, а зрабіць так, каб усе ўдзельнікі дарожнага руху адчувалі сябе камфортна і ў поўнай бяспецы. Аднымі карнымі мерамі дасягнуць такой «гармоніі» на дарогах немагчыма. Вось чаму мы надаём вялікую ўвагу прафілактычнай рабоце з вадзіцелямі і пешаходамі.

Супрацоўнікі ДАІ, між іншым, прымаюць таксама актыўны ўдзел і ў раскрыцці злачынстваў. Сёлета, напрыклад, было затрымана больш за 300 угоншчыкаў аўтатранспарту.

Словам, ДАІ, як і ўся беларуская міліцыя, працуе дзеля людзей, абараняе іх інтарэсы і законныя правы. Таму галоўны крытэрый ацэнкі нашай работы — грамадская думка.

— Пра хабарніцтва сярод «даішнікаў» яшчэ з савецкіх часоў існуе цэлая серыя анекдотаў. Хоць праблема даволі сур'ёзная. Як вы з ёй змагаецеся?

— Я не стаў бы меркаваць аб вастрыні праблемы хабарніцтва па колькасці анекдотаў. Мы ведаем мноства «народных твораў» аб знакамітых у мінулым людзях. Найчасцей у анекдотах яны выглядаюць непрывабнымі і камічнымі, хоць насамрэч былі зусім не такія. У многім гэта датычыцца і анекдотаў пра супрацоўнікаў ДАІ.

Так, праблема карупцыі вельмі сур'ёзная, бо падрывае аснову дзяржавы, негатыўным чынам уплывае на аўтарытэт улады. Таму мы без усякага шкадавання развіваемся з тымі супрацоўнікамі, якія заплямілі мундзір. Мы самі імкнёмся выявіць нядобрасумленных супрацоўнікаў, для чаго створана дзейсная сістэма кантролю, якая ўключае і правядзенне праверак з выкарыстаннем спецыяльнай апаратуры.

— У вас ёсць асабісты аўтамабіль?

— Ёсць. «Фольксваген» 1994 года выпуску. Праўда, вадзіцельскае пасведчанне маюць таксама мая жонка і дачка. Так што гэта наш сямейны аўтамабіль, якім карыстаемся падчас паездак за горад, на прыроду. Я найчасцей саджуся за руль у выхадныя дні.

— І калі вас апошні раз спынялі супрацоўнікі ДАІ?

— 1 студзеня гэтага года. Нягледзячы на Навагоднюю свята, мне ўсю ноч давялося працаваць. Раніцай я вяртаўся дамоў і мяне спыніў на дарозе супрацоўнік ДАІ Мінскай вобласці. Напэўна, ён проста хацеў праверыць мой фізічны стан, бо Правілаў дарожнага руху я не парушаў. Мне не давялося нават прадстаўляцца, мы проста павіншавалі адзін аднаго з Новым годам і я рушыў далей.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.25	15.49	7.24
Віцебск —	8.22	15.31	7.09
Магілёў —	8.15	15.39	7.24
Гомель —	8.03	15.44	7.41
Гродна —	8.39	16.05	7.26
Брэст —	8.31	16.14	7.43

Месяц

Маладзік з 16.01.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Амбросія, Ніла, Паўла, Івана;*
К. *Багуліны, Дамініка, Яўгена.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+3 — +5 °C, без ападкаў	МАСКВА	-4 — -2 °C
ВІЛЬНЮС	+1 — +3 °C, без ападкаў	РЫГА	+4 — +6 °C, без ападкаў
КІЕЎ	0 — +2 °C, без ападкаў	С-ПЕЦЯРБУРГ	+3 — +5 °C, без ападкаў

Дзве даты

20 снежня

1917 год — створана Усерасійская надзвычайная камісія (ВЧК). У канцы 1917 года, з нарастаннем пратэстуючых настрояў народных мас, перад бальшавікамі паўстала пытанне аб стварэнні спецыяльнага апарату для падаўлення супраціўлення новай уладзе. З гэтай мэтай і была ўтворана ВЧК на чале з Ф. Дзяржынскім.

1237 год — татарскія войскі хана Батыя ўзялі прыступам і спалілі Разань, пачаўшы ўварванне на Русь.

Цытата дня

«Непастаянства жанчын, у якіх я быў закаханы, кампенсавалася хіба што пякельным пастаянствам жанчын, якія былі закаханыя ў мяне».

Джордж Бернард Шоў (1856—1950), англійскі пісьменнік.

Подведены итоги рекламной игры ОАО «Криница» «Естественный отбор — естественно «Криница»

Криница

Поздравляем счастливчиков, которые под крышками «отборного пива» нашли свои «отборные призы»

В период с 10 сентября по 10 декабря 2006 года в Республике Беларусь проходила рекламная игра «Естественный отбор — естественно «Криница»

Контроль за ходом игры осуществляла специально созданная комиссия в составе:

1. ПЕТКЕВИЧ Григорий Иосифович,
ОАО «Криница», генеральный директор, срок полномочий с 10.09.2006 г. по 10.12.2006 г.

2. БОРИСЕВИЧ Владимир Иванович,
ОАО «Криница», начальник отдела маркетинга, срок полномочий с 10.09.2006 г. по 10.12.2006 г.

3. ВЛАСОВА Юлия Викторовна,
ОАО «Криница», специалист по рекламе, срок полномочий с 10.09.2006 г. по 10.12.2006 г.

В течение рекламной игры разыгрывались: 5 (пять) плазменных телевизоров «Филипс 42PF532112», 50 (пятьдесят) портативных DVD-плейеров «Филипс PET725», 100 (сто) MP3-плейеров «Филипс SA1300», 2000 (две тысячи) наборов по 6 пивных бокалов в картонной коробке «Естественный отбор — естественно «Криница».

Размер призового фонда составил 114 179 000 (сто четырнадцать миллионов сто семьдесят девять тысяч) белорусских рублей.

Благодарим всех участников рекламной игры «Естественный отбор — естественно «Криница».

Свидетельство о регистрации правил проведения рекламной игры №520 от 08.09.2006 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

По всем вопросам проведения игры и получения призов обращаться в Минске па телефону: 299-22-65.

Победителями рекламной игры стали:

Плазменный телевизор
Михейко А.В.
Мороз А.Ф.
Межевич А.О.

DVD-плейер
Овечкин Д.А.
Чешельская М.Н.
Яппарова М.В.
Ажар Н.М.
Ступень В.П.
Тюхай А.Э.
Рудый В.М.
Огородникова Л.В.
Самец Ю.П.
Черноусик Н.М.
Груша А.В.
Губин А.В.
Петрукович К.М.
Дунец Е.И.
Трацевская И.А.
Котович Г.М.
Загайнова Т.В.
Сечко В.К.
Стасюк Л.И.
Романовский А.В.
Боярин П.Н.
Досова И.В.
Садовская Л.С.
Рахманенко Н.Е.
Фуфаев О.В.
Ковзунов В.В.
Янукевич В.И.
Конончик Е.Л.
Рубин П.С.
Савицкий А.Н.
Малашенко Д.И.
Щербак А.К.
Клачко Р.С.
Пыж А.А.
Куликовский Д.А.
Пруников А.Л.
Ларчиков Н.А.
Берникова Е.И.
Кузнецов А.В.
Казакевич А. А.

MP3-плейер
Пурплевский А.А.
Гурский Д.В.
Любочка И.В.
Дубовская А.А.
Рыленко Д.И.
Атавин Д.В.
Могилевцева А.Я.
Красовский С.С.
Лихая А.И.
Зятиков Р.В.
Пущенкова Т.В.
Шралеко С.Л.
Лойко Е.А.
Лукашик С.В.
Котляренко С.В.
Соболь А.В.
Боярин П.Н.
Филипович Ю.В.
Козулин М.И.
Ковалев В.В.
Совков Д.А.
Буховецкий Л.Г.
Тарарук А.А.
Галюкевич А.А.
Дедкова Л.Н.
Герасимов С.М.
Газарян С.А.
Бриштель В.А.
Потапович А.И.
Чеховский А.И.
Шкель Н.Н.
Хмельницкий С.А.
Кухарчик Г.А.
Меречко А.Н.
Шимчик Н.В.
Кичкайло К.К.
Мартинович Ю.А.
Гришкевич Д.В.
Билинский Е.С.
Болтромсюк А. А.
Попов В.А.
Элле В.Д.
Гриневич А.В.
Васильев Ю.С.
Саковец О.В.
Липницкая Ю.А.
Щербаков Ю.А.
Галицкий К.А.
Шилович Д.Э.
Симоненко В.В.
Самсоненко В.Л.
Лукашик О.В.
Книжников А.В.
Костюченок С.А.
Маршин С.А.
Пыжов И.А.
Косакович А.А.
Гимель В.И.
Томашевич А.Г.
Козлов А.В.
Владимиров А.Г.
Шилов Ю.В.
Шелег Ю.В.
Кунина О.И.
Ахматова А.Л.
Юрченко Л.М.
Баринов Н. С.
Юхновец В. Д.
Казакевич А. А.

Наборы бокалов
Общее количество разыгранных наборов бокалов — 1086.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 36.281. Індэкс 63850. Зак. № 7054. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ФОРМУЛА ПАСЛЯДОЎНАГА ЎЗДЫМУ: ГУСТ, ЯКАСЦЬ, АСАРТЫМЕНТ

1976 2006

Віншавальная паштоўка



Паважаныя працаўнікі, ветэраны ААТ «Слуцкі мясакамбінат»!

Дазвольце горача і сардэчна павіншаваць вас з нашай агульнай юбілейнай датай — 30-годдзем з часу ўводу ў строй нашага прадпрыемства, а таксама з надыходзячым 2007 годам!

Найперш жадаю кожнаму моцнага здароўя, бадзёрасці, новых набыткаў у працы і дома. Дзякую усім вам, і асабліва ветэранам вытворчасці, за добрасумленную, стваральную працу. Няхай не пакідаюць вас творчы і душэўны ўздым, імкненне быць карыснымі людзям, свайму калектыву, родным і блізкім. Дабрабыту вам і вашым сем'ям.

Карыстаючыся выпадкам, дасылаю навагодняе віншаванне партнёрам — пастаўшчыкам сыравіны, прадпрыемствам гандлю, усім спажыўцам нашай прадукцыі, жадаю вытворчых і асабістых поспехаў у новым годзе, спадзяюся на далейшае плённае супрацоўніцтва.

З павагай дырэктар ААТ «Слуцкі мясакамбінат» Аляксандр Каламіец.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тэхнераўзбраенне ёсць крок у заўтра

Галоўны інжынер камбіната Юрый Бярозка да ліку найбольш істотных перамен, што адбыліся тут за апошнія тры гады, адносіць тэхнічнае пераўзбраенне, якое наспявала даўно і патрэбна было як паветра.

— Машыннае аддзяленне — сэрца каўбаснай вытворчасці, якое задае рытміку ўсёй наступнай рабоце, — заўважае Юрый Віктаравіч. — Можна лічыць, адсюль пачынаецца шлях да спажыўца вараных, паўвэнджаных і вэнджаных каўбас. Асноўнае абсталяванне для прыгатавання фаршу, — кутэры. У 2004—2006 гадах намі закуплены кутэры нямецкай фірмы «Зэйдэльман» К-324, г. зн. самыя сучасныя ўзоры на еўрапейскім рынку. Яны аснашчаны электронікай, датчыкамі адсочвання, якія кантралююць увесь тэхналагічны працэс, рэгулююць яго рэжымы, аблягчаюць працу персаналу. Інакш кажучы, задаецца праграма — і тэхналагічны працэс ідзе ў аўтаматычным рэжыме.

З установкай кутэраў, якія здольны выдаць у змену 60 тон каўбасных вырабаў, з'явілася шмат пераваг, асабліва ў паляпшэнні якасці атрымліваемага прадукту. І гэта не мяжа. Рынкі збыту, уласная гандлёвая сетка заяўляюць усе большыя аб'ёмы адгрузкі прадукцыі, што сведчыць аб канкурэнтаздольнасці прадпрыемства, яго амбіцыях заняць больш шырокі сектар на мясной «прасторы» краіны.

Значныя перавагі дала закупка дзвюх упаковачных ліній. Таксама высокатэхналагічных, нямецкай якасці, якія можна лёгка пераналаджваць і ўпакоўваць прадукт вагой ад 200 грамаў да 5 кілаграмаў. Прытым з выкарыстаннем спецыяльнай поліэтыленавай скрыначкі ці латка, які сама ж машына фармуе ў шматслойныя плёнкі і сама закрывае. Навацыю па вартасці ацанілі гаспадыні, паколькі ўпакоўка не дарагая, але надзвычай зручная ў ненне яго разнастайных густаў.

Перамены адбыліся і ў тэрмічным аддзяленні, дзе адбываецца варка каўбас. Устаноўлена некалькі новых тэрмакамер, здольных прапусціць праз працэс усю выраблену чарговай зменай прадукцыю. Рэжымы іх таксама кіруюцца і кантралююцца, так бы мовіць, «бартавым» камп'ютарам.

Перавагі польскіх «печаў» яшчэ і ў высокай іх энергазберагальнасці. Па меншай меры, у параўнанні з ранейшымі, якія саставрэлі і фізічна, і тэхнічна, эканоміцца 22—24 працэнты электраэнергіі. За год адна новая тэрмакамера дае 14 мільёнаў рублёў эканоміі. Эканамічны эфект ад павелічэння вытворчасці вараных каўбас склаў 66,5 млн рублёў. Лічбы, як бачна, сур'ёзныя, і з часам, пры дасканалым асваенні тэхнікі, росце кваліфікацыі кадраў, могуць быць яшчэ вышэйшымі.

Такім чынам, два аддзяленні, што нясуць асноўную нагрузку ў

дзе выкарыстана дацка-галандская сістэма ўтрымання жывёлы. Напрыканцы наступнага года яны павінны ўвайсці ў строй. У выніку магутнасць комплексу ўзрасце да 20—22 тысяч галоў.

Слуцкая марка — вядомая

Не застойваецца! У гэтым заліку кіраўніцтва і спецыялісты ба-

чаць асноўнае крэда калектыву. Асабліва датычыцца ён тых, хто працуе на пярэдняй лініі кантактаў са спажыўцом. Штогод слуцкія стваральнікі мяснога смаку імкнуцца ўдзельнічаць ва ўсіх рэспубліканскіх і міжнародных выставах. І не толькі ўдзельнічаць, а і перамагаць. Летась ААТ «Слуцкі мясакамбінат» удастоены адной з самых прэстыжных узнагарод — прэміі Урада Рэспублікі Беларусь у галіне якасці.

Дыяпазон толькі сёлетніх кантактаў уключае ўдзел у Днях Рэспублікі Беларусь у Краснадары, выставах тавараў беларускіх вытворцаў у Астане, Санкт-Пецярбургу, Маскве, а таксама «Прад-экспа», «Белагра» ў Мінску. Удзельнічаючы ў конкурсе «Наша марка» ў рамках знаходжання ў Санкт-Пецярбургу, за каўбасу «Слуцкая сыравяленая» і карэйку сыравэнджаную «Слуцкая» камбінат атрымаў 2 залатыя медалі, а за вараную «Доктарская паслуцку» — сярэбраны. На конкурсе «Густ» каўбаса «Раўбіцкая экстра», сыравэнджаная ўласнай распрацоўкі атрымала дыплом. А конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» прынёс адразу тры дыпломы.

Самы час падумаць аб стварэнні музея ўзнагарод, бо з кожным разам іх скарбонка расце і ў пэўным сэнсе распавядае пра гісторыю прадпрыемства, яго людзях, дасягненнях.

З мэтай азнаямлення з апошнімі харчовымі навінкамі прак-

Слуцку, Салігорску, Жыткавічах. Днямі адчыняецца яшчэ адзін — «Случанка» — па вуліцы Мендзялеева, 25 у Мінску, у якім разам з рознічным гандлем арганізаваны і аптовы. Такой паслугай могуць карыстацца як гандлёвыя прадпрыемствы, так і індывідуальныя прадпрымальнікі, што спецыялізуюцца на гэтым бізнэсе. Апроч таго, тут працуе кафетэрый — можна заўсёды нядрэнна падсілкавацца рознымі кулінарнымі прысмакамі ўласнага прыгатавання, уключаючы стравы беларускай нацыянальнай кухні.

«Настройка» на запыты спажыўца прыносіць свае плады і даволі важкія. Сёлета рэалізацыя прадукцыі ўзрасла ў параўнанні з мінулым годам на 25 працэнтаў. Па сутнасці, цяпер прадпрыемства працуе па заяўках партнёраў. У запасе заўсёды ёсць мабілізацыйны рэзерв і ён, пры патрэбе, можа быць уключаны ў дзеянне. Таму ў рэалізацыю ідзе толькі што выраблены прадукт, стварэць нейкі запас проста няма неабходнасці. Вытворчасць і рэалізацыя збалансаваны самым найлепшым чынам. І гэта, дарэчы, самая сучасная сістэма ўзаемаадносінаў са спажыўцом.

Са Слуцкім мясакамбінатам выгадна мець справу і пастаўшчыкам сыравіны, паколькі вываз жывёлы ажыццяўляецца транспартам прадпрыемства, установлена, як кажуць, поўная празрыстасць пры прыёмцы жывога тавару з непасрэдным удзелам прадстаўніка гаспадаркі-пастаўшчыка. Выхад мяса з жывой вагі тут таксама даволі высокі.

Адзінай камандай

Калі ў намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце Чэслава Шусціцкага спыталі, ці сустракаецца на прадпрыемстве такая загана, як «несуны», ён толькі ўсміхнуўся. Праблема канула ў небыццё, на такую ганьбу проста няма падстаў ісці. Па ўзроўню заработнай платы камбінат — на дастойным месцы ў горадзе. Створаны ўсе ўмовы, каб людзям добра працавалася і жылося.

Па-першае, тут, бадай, самая лепшая сталовая ў Слуцку, што пацвярджаецца наплывам жадаючых паабедаць менавіта ў ёй. Важна, што кошт абеду прымальны. Свае ж работнікі атрымліваюць яшчэ і талоны, якімі кампенсуецца прыкладна трэцяя частка затрат на харчаванне.

Прама на заводскай тэрыторыі размешчаны цяпліцы і невялікі палетак адкрытага грунту, дзе вырошчваецца гародніна для патрэб працаўнікоў камбіната. Паводле сведчання агранома цяплічнай гаспадаркі Ірыны Шкурскай, летась сабрана 6,5 тоны агуркоў, таматаў, морквы, капусты, буракоў. Частка ўраджаю пайшла на патрэбы сталовай, частка рэалізавана працуючым.

Санітарна-бытавыя ўмовы ў жывёлагадоўчым цэху пасля яго далучэння да камбіната значна адставалі ад тых, што на асноўнай вытворчасці. Там было абсталявана памяшканне пад раздзявалку з індывідуальнымі шафамі. З'явілася на комплексе, дзе працуе каля ста чалавек, і свая выдатная сталовая.

А неадкладную медыцынскую дапамогу члены калектыву могуць атрымаць у медпункце. Тут маюцца стаматалагічны і фізіятэрапеўтычны кабінеты.

Калектыўным дагаворам аб сацыяльным партнёрстве паміж адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам прадугледжаны шэраг ільгот для працаўнікоў, у тым ліку дадатковыя заахвочвальныя водпускі. Не застаюцца без увагі і шматдзетныя сем'і, а таксама сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці-інвалідзі. У ліку тых, хто карыстаецца асаблівай павагай і прыхільнасцю калектыву, паведаміла старшыня прафкама Зінаіда Адамчук, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, воіны-афганцы.

Каманду аднадумцаў згуртоўвае не толькі сумесная плённая праца, але і агульны адпачынак. Напрыклад, харавы калектыў камбіната ўжо некалькі гадоў носіць ганаровае званне «народны» і па сутнасці не мае роўных у горадзе. Сёлета стаў дыпламантам абласнога конкурсу «Пеўчае поле», пастаянна ўдзельнічае ва ўсіх урачыстасцях, канцэртах і ў сваіх сценах, і на гарадскіх сцэнічных пляцоўках.

Неблагія набыткі і ў фізкультурна-спартыўнай рабоце. Пэўна, яны будуць яшчэ больш значнымі пасля таго, як з'явіцца на прадпрыемстве спартыўная зала, аснашчаная неабходнымі трэнажорамі. А такая мара і магчымасць ёсць. І ведаючы, як дамагаецца кіраўніцтва пастаўленых мэтаў, верыш, што і гэтая задача будзе вырашана, спорт гэтаксама як і асноўная вытворчасць, будзе паслядоўна ісці на ўздым.

1. «З аддзялення экспедыцыі нашы вырабы трапляюць у гандаль», — гаворыць Мікалай СУЧОНАК.

2. «Дзесяткі грамат і медалёў сведчаць аб дасягненнях нашага калектыву», — гаворыць галоўны тэхнолаг Ганна ВАСІЛЕНКА.

3. Смачная высакаякасная прадукцыя выраблена на лініі, якой кіруе Юрый НЕСЦЕРАЎ-ГРЫЦКЕВІЧ.

4. Аператар Валянціна ДОЎБІК за ўстаноўкай, якая рыхтуе сыравіну да вэнджання.

5. У рабочай сталовай мясакамбіната.

6. Тут працуе аператар па адкорму свіней Наталля БАРЦЭВІЧ. Гэта памяшканне адно са шматлікіх на тэрыторыі жывёлагадоўчага комплексу, які належыць мясакамбінату.

7. Намеснік дырэктара па сельскай гаспадарцы Сяргей САСНОЎСКІ.

8. У лабараторыі штучнага асемянення. Тэхнік-асемянатар Алена ЗАЛЕСКАЯ.

9. У медпункце мясакамбіната. Прыём вядзе стаматолаг Анжэла СЯРЭДЗІНСКАЯ.

10. Начальнік гаспадарчага аддзела Георгій ПАДРЭЦКІ і аграном Ірына ШКУРСКАЯ ў памяшканні цяплічнай гаспадаркі.

11. Закройшчыца пашывачнага цэха Ірына ЦІМАХОВІЧ за вырабам адзення для рабочых мясакамбіната.

ААТ «Слуцкі мясакамбінат»

запрашае да супрацоўніцтва.

Наш адрас: 223610 Мінская вобласць, г. Слуцк, вул. Тутарынава, 18.

Тэл.: (8-01795) 5-80-80, 5-52-55. 4-63-78.

Факс: 4-52-25. E-mail: Smk.by@mail.ru.

Інтэрнэт: http://Kolbaski.com/

Чыгуначны код мясакамбіната — 6253.

Код станцыі Слуцк Бел. чыгунка — 148602.

Мікалай КАЧАТКОЎ, Віктар ПАЗНЯКОЎ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.